



Прынцэса Лубі́на не выносіла свайго дня народзінаў.

Калі ў каралеўскім садзе пачыналі з’яўляцца паветраныя шарыкі і плакаты «Віншуем, Ваша Высокасць», яна ішла да сябе ў пакоі ды замыкалася на ўсе чатыры ключы. Лубіна ўважала за лепшае сядзець пад замком — толькі б не святкаваць. Але сумаваць ёй там не даводзілася, не! Ва ўлюбёнай зале прынцэсы жыў белы папугай-какаду Цукрык. А ў спальні былі ванны, дзе яна ладзіла рэгату: гонку папяровых караблікаў.

Дзень народзінаў не падабаўся прынцэсе Лубіне таму, што быў дакучлівым госцем. Прыходзіў надта шмат разоў, апошнім часам — ужо без папытання. Цяпер ён збіраўся пагрукацца ў сямідзясяты раз. Так, менавіта столькі гадоў мусіла споўніцца Лубіне. Прынцэс звычайна ўяўляюць дзяўчынкамі альбо юнымі паненкамі, але яны бываюць і бабулькамі. Падбіраюць кіёчак пад колер сукенкі і носяць дыядэму ў сівых валасах.

Лубінін кій дзеля блізіру нагадваў парасон. Прынцэса якраз хацела падагнаць ім патрэбны караблік, калі раздаўся стук у дзверы.



А ідэя ў Маі была простая: вярнуць беднай бабульцы радасць свята.

Часу на гэта заставалася няшмат.

Мая нават не стала распакоўваць валізу, а таропка павязала фартух, насунула каптур ды паспяшалася да прынцэсы Лубіны.

Прынцэса чакала на падабед амлет са шпінатам і зялёным гарошкам. І вельмі здзівілася, калі ўбачыла ў амлеце запаленыя свечкі.

— Гэта яшчэ што? — ейныя бровы падскочылі да самай дыядэмы.

— Свечкі для торта, Ваша Высокасць, — бойка адказала пакаёўка. — Паглядзіце, якія прыгожыя! Напыленне з чыстага золата. А заўтра іх будзе значна болей!

— Вядома ж, болей, — усміхнулася прынцэса Лубіна. — Ажно семдзесят! Цяпер зразумела, чаму кухары спяклі торт у тры ярусы. На адным усе б не змясціліся.

Яна хутка патушыла свечкі, павыцягвала з амлету ды кінула ў клетку да папугая. Цукрык адразу прыняўся вастрыць аб іх дзюбу — золата так і пасыпалася!



Прынцэса Лубіна перамагла. Але гэтага ёй было недастаткова.






— Я мушу ўчыніць такое, — уголас падумала яна, — каб ад мяне раз і назаўжды адчапіліся з гэтым днём народзінаў! Але што я магу, мне ж... — ручаінка думак падскочыла фантанам, — ...столькі гадоў!

Вось яно! Людзі баяцца старасці. І таму маладзейшыя часам адчуваюць сябе няёмка поруч з бабулькамі ды дзядулькамі. Іх бянтэжаць тоўстыя акуляры, бутэлечкі з лекамі, старамодныя сумачкі, кіі, але больш за ўсё...

— Устаўныя зубы! — з відавочнай прыемнасцю прамовіла прынцэса Лубіна.

Між іншым, усе зубы ў яе былі свае, бо яна заўсёды добра іх чысціла. Але ніхто, апроч каралеўскага доктара, пра гэта не ведаў.

Прынцэса адправіла цыдулку знаёмаму майстру, і той даслаў ёй у адказ цудоўную ўстаўную сківіцу. З сакрэтным механізмам.

— Выдатна, — захапілася Лубіна. — Трэба пакласці гэтую штуку на самую верхавіну торта. Наўпрост на надпіс «70 гадоў»!

